ВЕСЦІ АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ
№ 2 1995

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

# АКАДЭМІК АН БЕЛАРУСІ ПАВЕЛ ПРАКОПАВІЧ РАГАВЫ
## (Да 100-годдзя з дня нараджэння)



Споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння акадэміка АН Беларусі Паўла Пракопавіча Рагавога — аднаго з вядучых глебазнаўцаў Беларусі, таленавітага арганізатара глебавай навукі ў рэспубліцы.

Павел Пракопавіч нарадзіўся 15 чэрвеня 1895 г. у вёсцы Навілаўка на Гомельшчыне. Пасля паспяховага заканчэння пачатковай школы, а потым гарадскога вучылішча ў 1915 г. ён заканчвае настаўніцкую семінарыю. У час імперыялістычнай вайны быў прызваны ў армію. Службу праходзіў у Сібіры і Туркестане.

Далейшую адукацыю П. П. Рагавы атрымаў ужо пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Пятроўскай (зараз імя К. А. Ціміразева) сельскагаспадарчай акадэміі. Займаючыся ў акадэміі, ён праявіў цікавасць да праблемаў глебазнаўства і потым усё сваё жыццё прысвяціў навуцы пра глебу. Яшчэ будучы студэнтам-выпускніком Пятроўскай акадэміі, П. П. Рагавы разам з М. Г. Чыжэўскім у 1922 г. абследаваў глебы Беларускай сельскагаспадарчай дoff доследнай станцыі (у Банцэраўшчыне), што з'явілася першым вопытам даследавання глебаў рэспублікі.

У 1923 г. пасля заканчэння акадэміі Павел Пракопавіч вяртаецца ў Мінск і прыступае да працы на пасадзе асістэнта кафедры глебазнаўства Беларускага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі. У гэтым жа годзе пачаў функцыянаваць інстытут беларускай культуры, пры якім была створана глебава-геалагічная камісія, вучоным сакратаром якой прызначылі П. П. Рагавога. На камісію ўскладвалася праца па каардынацыі глебавых і геалагічных даследаванняў у рэспубліцы. У 1924 г. яна правяла навуковую нараду, на якой быў абмеркаваны і ўхвалены план даследаванняў па геалогіі і глебазнаўстве.

У 1925 г. на базе Мінскага і Горацкага сельгасінстытутаў была створана Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія (г. Горкі Магілёўскай вобл.). З гэтага часу Горкі сталі кіруючым цэнтрам глебавых даследаванняў, якія праводзіліся на тэрыторыі рэспублікі з 1925 да 1931 г. На падставе гэтых даследаванняў у 1930 г. складзена папярэд-

няя зводная карта глебаў Беларусі. Матэрыялы гэтых даследаванняў апублікаваны Я. Н. Афанасьевым, П. П. Рагавым, А. Р. Мядзведзевым, Н. П. Булгакавым, П. А. Кучынскім і інш.

У 1930 г. у Гомелі на базе лесагаспадарчага факультэта Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі ствараецца Беларускі лесатэхнічны інстытут. Загадчыкам кафедры глебазнаўства і геалогіі ў гэтым інстытуце прызначаецца П. П. Рагавы. Адначасова ён узначальвае працы па глебазнаўстве ў Навукова-даследчым інстытуце ляспой гаспадаркі, чытае лекцыі па геалогіі і земляробстве ў Інстытуце механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

У 1931—1932 гг. пад яго кіраўніцтвам праводзяцца даследаванні асушаных тарфяна-балотных глебаў у міжрэччы Дняпра і Прыпяці, а потым на працягу трох гадоў (1933—1935) даследуюцца глебы ў поймах рэк Дняпра, Сожа і Прыпяці. Па матэрыялах гэтых даследаванняў напісана манаграфія. У 1936 г. пачаліся вялікія стацыянарныя даследаванні воднага рэжыму глебагрунтоў на трох стацыянарах ва ўмовах поля і лесу.

У 1941 г. інстытут з Гомеля эвакуіруецца ў Свярдлоўск, і Павел Пракопавіч з 1941 да 1944 г. узначальвае кафедру глебазнаўства ва Уральскім лесатэхнічным інстытуце, а таксама вядзе даследчую працу па вывучэнні лясных глебаў Сярэдняга Урала ў складзе экспедыцыі пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН СССР В. Н. Сукачова. Тут жа ў 1942 г. ён становіцца доктарам сельскагаспадарчых навук.

У 1944 г. пасля вызвалення Беларусі П. П. Рагавы разам з інстытутам пераязджае ў Мінск і зноў прыступае да вывучэння глебаў рэспублікі. У першыя два пасляваенныя гады ён прымаў удзел у даследаваннях глебаў заходніх абласцей Беларусі (Гродзенскай, Брэсцкай, Маладзечанскай). Потым пачаліся працы па звядзенні ўсіх наяўных матэрыялаў па глебавых даследаваннях, на аснове якіх у 1949 г. пад рэдакцыяй П. П. Рагавога і І. С. Лупіновіча была складзена і выдадзена карта глебаў, а ў 1952 г.— кніга «Глебы БССР». За вялікі ўклад у развіццё тэарэтычнага глебазнаўства і вывучэнне глебавага покрыва рэспублікі П. П. Рагавы ў 1953 г. быў абраны акадэмікам АН БССР.

Па рашэнні ўрада рэспублікі ў 1957 г. пачаліся працы па буйнамаштабных глебавых даследаваннях зямель калгасаў і дзяржгасаў, якія з'яўляюцца найбольш важнай з'явай у гісторыі вывучэння глебавых рэсурсаў рэспублікі. Для выканання гэтых прац і метадычнага кіраўніцтва імі ў складзе Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі ў 1958 г. быў створаны Навукова-даследчы інстытут глебазнаўства, які ўзначаліў акадэмік П. П. Рагавы. У выніку гэтых даследаванняў усе гаспадаркі рэспублікі атрымалі матэрыялы з поўнай характарыстыкай глебаў іх тэрыторыі (глебавыя карты, картаграмы аграгрупаў і рацыянальнага выкарыстання зямель, аграхімічныя картаграмы і глебавыя нарысы), якія паслужылі навуковай асновай вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці ў рэспубліцы. Акрамя гэтага пад кіраўніцтвам П. П. Рагавога ў Інстытуте глебазнаўства былі праведзены вялікія даследаванні па вывучэнні ўласцівасцяў глебаў і іх змены пад уплывам агратэхнічных мерапрыемстваў ва ўмовах стацыянара, па вывучэнні дынамікі глебавых працэсаў.

З 1964 г. П. П. Рагавы ўсе свае сілы накіроўвае на падрыхтоўку маладых спецыялістаў у Тэхналагічным інстытуце (да 1961 г.— Лесатэхнічны), дзе ён узначальвае кафедру глебазнаўства. Сіламі супрацоўнікаў гэтай кафедры праведзена вялікая праца па вывучэнні глебаў і воднага рэжыму глебагрунтоў у Негарэльскім вучэбна-доследным лясгасе.

Усе праведзеныя П. П. Рагавым даследаванні насілі творчы, прыкладны характар. Менавіта Паўлу Пракопавічу належыць велізарная заслуга ў паляпшэнні ўрадлівасці глебаў, аховы глебаў і глебавага покрыва ад дэградацыі.

Па матэрыялах праведзеных даследаванняў П. П. Рагавым напісана каля 150 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій і падручнік глебазнаўства на беларускай мове, які вытрымаў два выданні.

Шмат увагі і энергіі аддаваў Павел Пракопавіч педагагічнай і грамадскай працы, падрыхтоўцы навуковых кадраў па сельскай і лясной гаспадарцы, многія з якіх зараз дастойна працягваюць справы, пачатыя іх таленавітым настаўнікам.

*М. І. СМЯЯН*